Весткі й Паведамленьні

інфармацыйны бюлетэнь Згуртаваньня “ПАГОНЯ”

Viestki j Paviedamlenni

Сусьветнае сеціва: e-krama.com, www.pahonia.org
Электронны адрас: viestki@mail.com
✉ VIESTKI, P. O. Box 3225, Farmingdale, NY 11735

№ 2 (576)
Люты 2014 г.

Вяртаньне мовы і свабоды

Мова ёсьць найвялікшае дасягненьне культуры. “На пачатку было слова.” Мова – гэта чалавецтва. Нічога, што створана чалавецтвам, няма вышэй і важней за мову. Мова народу для кожнага народу мае такое ж значэньне, як фэнамэн мовы для ўсіх людзей.

Мова не належыць толькі таму пакаленьню, якое жыве. Яна дзеля мінулага і будучыні. Яна дзеля вечнасьці.

Мова ёсьць першасным і найвялікшым сродкам культуры. Нацыянальная родная мова ёсьць ключом для адкрыцьця генэтычных магчымасьцяў асобы ў рэалізацыі яе інтэлектуальнага разьвіцьця. Гэта вядома было яшчэ ў XIX стагодзьдзі (расейскі пэдагог К. Ушынскі) і пацьверджана сучаснай навукай, якая дасьледуе генэтыку і мазгі чалавека.

Найвялікшая небясьпека для народнай мовы – акупацыя і акупацыйная палітыка. Акупацыі бываюць розныя і маюць гістарычныя характарыстыкі.

Расейская акупацыя Вялікага Княства Літоўскага (Беларусі) – гэта была акупацыя на нацыянальную сьмерць, дзе галоўным накірункам маскоўскай палітыкі было вынішчэньне беларускай мовы. Ворагі лічылі, што вынішчэньне беларускай мовы адначасна з русіфікацыяй – гэта тое зьвяно, якое дазволіць ім разбурыць усю беларускую нацыянальную культуру і ліквідаваць народ, выкінуць яго з мапы Эўропы.

Разьлік расейцаў быў дакладным. Ёсьць некалькі складовых асноваў існаваньня нацыі, характэрных для ўсіх народаў і краінаў, – гэта мова, рэлігія, геаграфічнае палажэньне, гісторыя, этнічная супольнасьць, культура і г. д. Сярод названых асноваў у кожнай нацыі (у залежнасьці ад абставінаў) ёсьць прыярытэты, на якіх трымаюцца ўсе каштоўнасьці. Для габрэяў, напрыклад, гэта іхняя гісторыя і рэлігія, для ірляндцаў – каталіцызм, для бальшыні эўрапейцаў – нацыянальная мова.

Для Беларускай нацыі найважнейшым грунтам існаваньня і разьвіцьця зьўляецца беларуская мова плюс гісторыя. Ліквідацыя беларускай мовы для беларусаў абазначае нацыянальную сьмерць. Беларуская нацыя трымаецца на беларускай мове. Гэта цудоўна разумелі ўсе беларускія нацыянальныя дзеячы (“Шануйце мову нашую, беларускую, каб ня ўмерлі” – Ф. Багушэвіч) і дакладна асэнсавалі галоўныя ворагі і нішчыцелі беларускай нацыі – маскоўцы.

Задача нумар адзін усёй маскоўскай палітыкі на яе заходнім кірунку – ліквідацыя беларускай мовы і русіфікацыя. Без дасягненьня такой мэты Масква ніколі ня зможа перамагчы Беларусь. Расейскія палітыкі гэта ведаюць і дасягнулі ў Беларусі вялікіх разбуральных вынікаў, галоўным чынам, дзякуючы акупацыйнай палітыцы, выкарыстаньню палітычных стаўленьнікаў, эфэктоўнай прапагандысцкай і ідэалягічнай апрацоўцы беларускіх эліт і ўсяго насельніцтва. Тое, што ў гэтым сьмяртэльным змаганьні ведаюць і разумеюць маскоўцы, ня бачыць і не разумее бальшыня беларускага грамадзтва. Адбылося глыбокае і змасаванае асьляпленьне праціўніка і спадзевы Масквы павялічыліся.

Усялякі зрух беларусаў у абароне беларускай мовы і беларускай адукацыі выклікае нэрвовую рэакцыю маскоўцаў, часам гістэрычную і, на першы погляд, неадэкватную. Сьведама ці нясьведама яны трывожацца за лёс сваёй антыбеларускай палітыкі ў Беларусі і баяцца правалу палітычнай задачы нумар адзін. Гістэрычныя паводзіны, неадэкватныя ўспышкі нянавісьці да беларускай мовы (якая ўжо ледзь дыхае) тлумачацца імпэрскай, антыбеларускай зададзенасьцю маскоўскай палітыкі і страхам за яе правал.

Дзеяньне маскоўскай палітыкі у Беларусі шляхам выкарыстаньня антыбеларускага рэжыму Лукашэнкі нагадвае вайну акупацыйнай арміі, якая найперш страляе ідэалагічнымі патронамі ды палітычнымі кулямі, а потым ужо, не спатыкаючы супраціву, пачынае граміць дубінамі ды аглоблямі.

Сутнасьць такога становішча вобразна і адпаведна раскрыў адраджэнскі палітык Юры Беленькі, зьвяртаючыся да моладзі: **“Моладзь, памятай: калі ты размаўляеш на расейскай, ты ў акупацыйнай арміі, якая страляе ў твой народ”**.

Цікава, што гэты дакладны, палітычна вывераны лёзунг зноў, як звычайна, па зацяганым маскоўскім шаблоне выклікаў чарговую штучную гістэрыку агентуры і лукашыстаў. Гёбельс малее перад нэўрастэніяй “рэзідэнтаў” і “прапагандыстаў”. Тут яны раскрываюцца вельмі выразна. Асноўны прыём – перакручваньне лёзунга і нападкі на свае ж выверты. Тыповы савецкі прапагандысцкі падыход і клясычная гёбельсаўшчына. І так увес час.

Што было разбурана і зьнішчана за 200 гадоў акупацыі і як нішчаць беларускую культуру і мову цяпер – вядома. Усё гэта будзе падлічана падрабязна і прад'яўлены рахунак нішчыцелям. Але ўжо цяпер трэба ставіць сабе пытаньне, якім чынам пасьля цёмнай навалы трэба будзе аднаўляць страчанае і як адрадзіць разбуранае?

У 2006 годзе на так званым “усебеларускім сходзе” начальнік антыбеларускага рэжыму выказаў у завуаляванай форме стратэгічную мэту маскоўскай акупацыйнай палітыкі ў Беларусі і ўскладзеную на яго разбуральную місію: **“Зрабіць так, каб нічога ўжо нельга было вярнуць назад”**.

Гэта, між іншым, тэза расейскага НКВД, якім яны кіраваліся ў акупаванай Беларусі амаль усё XX-е стагодзьдзе. Цяпер паўтараюць тое самае.

* * *

Пасьля ліквідацыі рэжыму першае, што трэба будзе зрабіць беларусам – гэта адмяніць усе антыбеларускія і фальсыфікацыйныя, антызаконныя акты цёмнага рэжыму. Уводзіцца ў дзеяньне Канстытуцыя 1994 году. Аднаўляюцца дзяржаўныя Сьцяг і Герб, зацьвярджаецца дзяржаўны гімн.

Канстытуцыя 1994 году стварае грунт для адраджэньня дзяржаўнай беларускай мовы і адукацыі. Доўгія гады цёмнага рэжыму і вынішчэньня мовы паказалі, аднак, што ня ўсё

Працяг на бачыне 2

Студзеньскі сход Згуртаваньня "Пагоня"

У суботу, 11 студзеня ў Доме Маракоў на Мангэтане прайшоў першы ў 2014 годзе сход Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня "Пагоня". Напачатку сходу старшыня сп. Віталь Зайка прывітаў прысутных і павіншаваў з Новым годам і Калядамі, пажадаў здароўя, дабрабыту і актыўнай дзенасьці на карысьць беларускай справы. Затым ёе даў кароткі агляд мэтаў і прынцыпаў арганізацыі, вынікаў яе двухгадовай дзейнасьці. Гэтыя вынікі адлюстроўвае таксама прыгожы новы каляндар, які нядаўна быў выдадзены.

Затым сп. В. Зайка даў агляд свайго бачаньня бягучага моманту ў жыцьці Злучаных Штатаў, падкрэсьліў насьцярожваючыя нэгатыўныя тэндэнцыі й зрухі, што назіраюцца ў амэрыканскім грамадстве. У сьвятле мажлівых закалотаў ды этнічных забурэньняў ён заклікаў прысутных, усіх прадстаўнікоў беларускай грамады ў Амэрыцы, не губляцца пасьля асягненьня легальнага статусу, не забывацца на беларускія арганізацыі, цэрквы, на імпрэзы і акцыі беларускага актыву. Прамоўца заклікаў прысутных карыстацца нагодай сустрэчы з землякамі, знаёміцца, абменьвацца інфармацыяй пра жытло, працу, вучобу, юрыдычную дапамогу. "Праз дапамогу адно аднаму адбываецца дапамога і мацаваньне арганізацыі".

Затым слова ўзяў сябар управы Згуртаваньня "Пагоня" сп. Віктар Едзіновіч. Ён распавёў пра імпрэзу, ладжаную супольна "Пагоняй", Беларуска-Амэрыканскім Задзіночаньнем і арганізацыяй "Беларусы ў экзылі" 21 сьнежня 2013 году каля штаб-кватэры ААН на Мангэтане. Акцыя была прысьвечаная 3-й гадавіне пратэсту жыхароў Менску супраць парушэньняў і фальшаваньняў на прэзыдэнцкіх выбарах у Беларусі 19 сьнежня 2010 году, які быў жорстка задушаны рэжымам Лукашэнкі. Былі добрыя прамовы, і прыйшло спора людзей. Сп. В. Едзіновіч адзначыў наяўнасьць прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі, але адначасна згадаў недастатковую актыўнасьць прысутных на мітынгу, калі частка сьцягоў, якія ён прывёз на мітынг, была не задзейнічаная ў акцыі, пакуль прысутных пэрсанальна не папрасілі ўзяць у рукі тыя сьцягі. Наагул, на думку прамоўцы, падобныя акцыі мусяць быць лепей і загадзя падрыхтаваныя інфармацыйна і арганізацыйна. Затым сп. В. Едзіновіч выказаў свае думкі датычна выступу сп. В. Зайкі пра бягучы момант у Амэрыцы і адзначыў слушнасьць аналізу, падкрэсьліўшы пры гэтым, што ён настаўлены аптымістычна, ня гледячы на трывожныя тэндэнцыі, і што спадзяецца на стваральны і моцны амэрыканскі характар.

Сп. Арцём Гусак прапанаваў прысутным пазнаёміцца бліжэй, стаўшы ў кола. Сябры і госьці так і зрабілі і, перакідваючы мячык з адначаснымі пытаньнямі пра імя, адкуль у Беларусі, колькі часу ў Амэрыцы, чым займаесься, якія пляны, пераразнаёміліся і мелі таксама нагоду даведацца пра землякоў са сваёй мясьціны Бацькаўшчыны. Такі крэатыўны фармат пастудова зьняў няёмкасьць і сарамлівасьць, раскрыў прысутных адзін да аднаго і быў прызнаны прысутнымі вартым разьвіцьця, удасканаленьня, і стасаваньня таксама на наступных сходах, каб узмоцніць камунікатыўнасьць, давер і салідарнасьць у арганізацыі.

Віталь ЗАЙКА



Вяртаньне мовы і свабоды

Працяг з бачыны 1

так дрэнна, бо беларускі народ прыхільны да сваёй дзяржавы, да Незалежнасьці і да сваёй мовы. Выходзячы з гэтага, ёсьць магчымасьць праводзіць спакойную і ляяльную да цяжкага стану грамадства палітыку культурнага адраджэньня. Важна толькі, каб была беларуская дэмакратычная ўлада і, каб краінай кіравалі патрыёты Беларусі.

Першае правіла. Ня трэба ствараць ніякіх моўных абмежаваньняў для людзей у грамадстве, ня трэба вызначаць ніякіх тэрмінаў пераходу на мову. Усё адбудзецца паступова само сабой пры культурніцкай і адукацыйнай падтрымцы беларускай дзяржавы і дзяржаўнай праграмы моўнага разьвіцьця. Тэрмін для авалоданьня дзяржаўнай мовай будзе вызначаны толькі для дзяржаўных служачых і чыноўнікаў (звычайна гэта пяць гадоў паводле існуючай міжнароднай практыкі).

Заканчэньне на бачыне 3

Заканчэньне на бачыны 2

Вопыт доўгіх гадоў антыбеларускага рэжыму паказаў, што галоўнае, каб не душылі, не плявалі ў твар, не зачынялі школы, не кідалі ОМОН на Беларускі ліцэй, каб далі магчымасьць вольна разьвівацца, вучыцца, гаварыць пра сваё і пра ўсё. А нармальная Беларуская дзяржава дасьць такую магчымасьць усім і падтрымае.

Трэба разумець, што расейская мова нам ня страшная, калі ня будзе палітыкі русіфікацыі. А яе пасьля цёмнага рэжыму ня будзе.

Трэба ўлічыць, што за гады цёмнага рэжыму цэлае пакаленьне людзей прайшло праз расейскую школу, беларуская мова рэжымам нідзе не прызнавалася. Большая палова беларусаў, якія любяць сваю краіну і ведаюць, што іхняя мова беларуская, карыстаюцца і змушаны былі карыстацца толькі расейскай мовай. Беларускую мову антыбеларускі рэжым выціснуў амаль адусюль.

Як мусіла б выглядаць гэтае "першае правіла" на практыцы пры сапраўднай беларускай уладзе і ў дачыненьні з уладай?

Улада будзе карыстацца дзяржаўнай беларускай мовай і валодаць мовай міжнацыянальных зносінаў (гэта значыць расейскай мовай згодна Канстытуцыі 1994 г.). Аднак, зразумела, што шмат хто зь дзяржаўных чыноўнікаў беларускай мовай цяпер не валодае. Ніхто за гэта ня будзе іх звальняць з працы. Будуць прапанаваныя бясплатныя курсы мовы. Чыноўнік можа праігнараваць курсы і не вучыць дзяржаўную мову. Ніхто таксама ня будзе яго за гэта і ў гэты пяцігадовы пэрыяд звальняць. Але веданьне дзяржаўнай мовы будзе ўведзена ў кляснасьць чыноўнікаў і да зарплаты будзе дадавацца каэфіцыэнт. Прылежнасьць і навучаньне мусяць быць узнагароджаны.

Акрамя таго з гадамі будуць выходзіць зь беларускіх школаў і ўнівэрсытэтаў добра падрыхтаваныя, адукаваныя кадры, і чыноўнік, які не захацеў вучыцца, ня вытрымае ні конкурсу, ні канкурэнцыі.

Грамадзянін Беларусі прыходзіць у дзяржаўную ўстанову, размаўляе і піша заявы (паданьні) і атрымлівае адказы на той мове, на якой яму зручна (гэта значыць на беларускай ці на расейскай).

Тут не павінна ўзьнікаць ніякіх праблемаў для грамадзяніна. Трэба разумець становішча, якое будзе выпраўляцца паступова і натуральна, разам з ростам вольнага пакаленьня.

У сыстэме адукацыі мусіць быць адноўлена беларуская лінейка адукацыі. Гэта значыць – беларуская школа, беларускі ўнівэрсытэт, плюс беларускія дашкольныя ўстановы. Тут ужо ёсьць вопыт 90-х і добрыя вынікі.

Будзе ўзвышана значэньне і роля настаўніка, істотна павялічана зарплата, выпраўлены савецкі і рэжымны (жаночы) перакос у фармаваньні школьных пэдагагічных кадраў. Спрыяльны падыход павінен быць ва ўсёй сыстэме адукацыі, асабліва ў вышэйшай, якая (зразумела, па самой сытуацыі) павінна апярэдзіць школу і стаць беларускай па мове, па зьмесце і па духу. Трэба ўсьведамляць, што імгненна тут нічога ня зробіцца. (У чэскіх унівэрсытэтах яшчэ доўгі час пасьля абʼяўленьня незалежнасьці некаторыя лекцыі чыталіся па-нямецку.)

І ў нас, можа нават працяглы час, некаторыя лекцыі, напэўна, будуць гучэць па-расейску. Трэба ведаць, што гэта зусім не бяда, а пераходны пэрыяд.

Тут мусіць існаваць сыстэма руху наперад. У пераходны пэрыяд (гэта значыць часова, на пэўны тэрмін) будзе грамадзкая дапамога, будуць створаныя грамадзкія фонды падтрымкі беларускай вышэйшай адукацыі, фондавыя даплаты пэдагогам за мову навучаньня. Нашая вялікая мова заслугоўвае грунтоўнай кампэнсацыі за дзьвесьце гадоў нішчэньня, абплёўваньня, дыскрымінацыі, паніжэньня і забароны. Дэмагогія ворагаў чалавецтва аб "уціску" расейскай мовы тут ня пройдзе. Беларусы натуральным чынам, законна і з поўным правам, ўсім грамадзтвам, карыстаючыся адначасна і расейскай мовай, выправяць векавыя разбурэньні ворагаў нацыі і культуры, даўшы сваёй беларускай мове вольны шлях ў вольнае жыцьцё.

Самае галоўнае, на што я тут спадзяюся, што на старце (у атмасфэры дабразычлівасьці і даверу) кожны беларус, чыноўнік, пэдагог (беларускамоўны ці расейскамоўны) павінен адчуць сябе запатрабаваным для нацыі, для вялікай справы свабоды і нацыянальнага адраджэньня. Адным словам, мусіў бы стацца ўздым добрых справаў і сьветлага энтузіязму. А гэта вялікая стваральная сіла.

Велізарнае значэньне для адраджэньня дзяржаўнасьці беларускай мовы і для веданьня мовы ўсімі грамадзянамі Беларусі (у тым ліку і мігрантамі) ёсьць дзяржаўнае беларускае радыё і тэлебачаньне – тое, што ліквідаваў цёмны рэжым. Усё гэта будзе адноўлена адразу, гэтак жа, як і дзейнасьць забароненых і ліквідаваных беларускіх радыёстанцыяў і праграмаў.

Мяркую, што за сымбалічную аплату (а магчыма і бясплатна) будзе ажыцьцёўлена дзяржаўная мадэрнізаваная сыстэма "Радыё ў кожны дом" (кшталту праваднойсеткі, але ў новых тэхналягічных магчымасьцях), бо такая інфармацыйная прапанова зусім не састарэла і вельмі карысная для ўсьведамленьня і разьвіцьця перш за ўсё роднай мовы (пацьверджана практыкай).

Прыстойнае нацыянальнае тэлебачаньне і радыё, акрамя непасрэднага агучваньня мовы, павінны падняць яе прэстыж і значэньне для беларуса добрым ўзроўнем сваіх аўдыё і тэлепраграмаў.

З усіх грамадзкіх арганізацыяў моўнага ўплыву асобна стаіць пытаньне аб мове ў рэлігійных сьвятынях. Тут трэба разумець, што аддзяленьне царквы ад дзяржавы зусім не азначае аўтаномію царкоўнай арганізацыі і выхад яе з-пад закону, як некаторыя часам думаюць. Аддзяленьне ад дзяржавы абазначае, што царква не трактуецца як дзяржаўны ворган, не выкладаецца абавязковы Закон Божы ў школе (але можа быць як факультатыў), усе царкоўныя дакумэнты, выдадзеныя людзям (аб шлюбе, аб хрышчэньні і т. п.) не ацэньваюцца як афіцыйныя дакумэнты, ніякае дзеяньне царквы не ўплывае на юрыдычныя і грамадзянскія дачыненьні асобы. І ўсё на гэтым. Царква падпарадкоўваецца ўсім законам, якія прынятыя ўладай. Яна можа, скажам, не рэагаваць на Закон. Але калі ў царкоўных шапіках пачне прадавацца, напрыклад, чарнасоценная, расейская фашыстоўская, антысэміцкая ці антыбеларуская літаратура, то гэта ўжо падходзіць пад парушэньне, якое адлюстравана ў праве і караецца паводле адпаведнага праўнага кодэксу.

Беларуская вольная дзяржава магла б, на маю думку, заключыць канкардат з усімі цэрквамі, дзе было б (сярод іншых) адзначана пытаньне аб дзяржаўнай мове ў сьвятынях і храмах, бо дзяржаве цяжка быць прыхільнай царкве, якая ігнаруе (і нават не шануе) беларускую дзяржаўную мову.

Павінен адзначыць, згодна нават практычных назіраньняў, што тыя пытаньні і тэмы, ад якіх ворагаў беларушчыны кідае ў немарасьць, гістэрыку і шалёную злосьць, павінны стаць для нас прыярытэтам, першачарговай задачай аднаўленьня. А гэта Беларуская мова, Беларускі Сьцяг і герб Пагоня. З гэтых каштоўнасьцяў цёмны рэжым пачаў зьнішчэньне ўсяго беларускага. З гэтых каштоўнасьцяў (пасьля ліквідацыі рэжыму) трэба пачаць нашае нацыянальнае вяртаньне і адраджэньне сьветлай Беларусі.

ліпень-лістапад 2013 г.

Зянон ПАЗЬНЯК

“Галгатня пра ЗыШыА”

Розум, замкнёны на ключ

Калі я гадаваўся ў дзеда з бабаю, а было гэта ў канцы 80-х, пачатку 90-х гадоў, то мы ніколі не замыкалі хату. Замок вешалі толькі тады, калі ўсе сыходзілі ў поле, і каля хаты доўгі час нікога не было. Час быў такі, норавы былі адпаведныя, ну і магчыма калярыт быў свой – у завулку стаялі хаты амаль адных сваякоў. Часу трохі мінула, большасьці сваякоў ужо няма, ну і норавы, адпаведна, ужо ня тыя...

Старыя амэрыканцы кажуць, што калісьці ў Амэрыцы было тое самае, але няма таго, што раньш было – цяпер і замок не перашкода. А вось у амэрыканскіх унівэрах пайшла цалкам новая, дурная завядзёнка – падчас гадзін працы не зачыняюць дзьверы офісаў. Усім выкладчыкам рэкамэндуецца пакідаць дзьверы прыадчыненымі на выпадак, калі студэнтка ці студэнт абвінавацяць у згвалтаваньні. Прадпрымальныя студэнкі пранюхалі, што гэта ня самы дрэнны спосаб запэўніць сабе бязьбеднае існаваньне падчас навучаньня і нават нейкі час пасьля заканчэньня. Адчыненыя дзьверы маюць быць доказам выкладчыцкай бязьвіннасьці. Выкладчык, у якога дзьверы былі зачыненыя, зьяўляецца загадзя вінаватым, ну ці, як мінімум, падазроным.



Такім чынам, новая Амэрыка, то бок Амэрыка, якая цяпер асноўваецца на антыамэрыканскіх вартасьцях, адкрыта і ва ўсіх на вачох гвалціць прэзумпцыю невінаватасьці, карані якой выводзяцца з рымскага права. Адвечны амэрыканскі прынцып „innocent until proven guilty” (не вінаваты пакуль не даведзена адваротнае), перакулены дагары нагамі і цяпер гучыць „guilty until proven innocent” (вінаваты пакуль не даведзена адваротнае). Студэнтка ляпнула, а ты ўжо дакажы, што не вярблюд, тым больш калі ў цябе былі зачыненыя дзьверы.

Я дык з гэтым глупствам змагаюся ад панядзелку да пятніцы. Дзьверы майго офісу заўжды шчыльна зачыненыя. Горшым ад фізычнага згвалтаваньня і ад пагрозы турмы можа быць толькі гвалт над здаровым розумам.

Віталь ВОРАНАЎ

Уплаты ў Згуртаваньне
Ñêëàäê³ é àõâÿðààíüí³:

Т. Болт	50
А. Гусак	50
В. Едзіновіч	50
У. Жлукцёнак	50
А. Кікоін	50

Усім шчыры дзякуй!

Уплаты ў аддзел шліце на адрас:
P. O. Box 572
New York, NY 10113
Чэкі выпісвайце на імя
Viktar Yedzinovich.

Шаноўныя сябры!
*Калі ласка, сваечасова абнаўляйце падпіску на бюлетэнь (**гл. інфармацыю аб апошнім ахвяраваньні на канвэрце справа ад прозьвішча**).*

Наступны сход

Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня “ПАГОНЯ” адбудзецца **ў суботу 8-га лютага 2014 году** на Мангэтане.

Месца правядзеньня сходу:

Seafarers and International House
123 East 15th Street
New York, NY 10003.

*Даезд цягнікамі падземкі **L, N, Q, R, W, 4, 5, 6** да станцыі падземкі **Union Square**.*

Будынак знаходзіцца адзін блёк на ўсход ад Union Square па 15-й вуліцы на скрыжаваньні з Irving Place.

Заля знаходзіцца на другім паверсе будынка.

Пачатак: **а 6:00-й** вечара.

Ахвяравалі на выданьне бюлетэня *Весткі й Паведамленьні*:

М. Белямук	30
В. Едзіновіч	30
У. Жлукцёнак	30
А. Курушка	30
А. Пранцэвіч	30
І. Ціткова	30

Шчыры дзякуй!

*Падпісацца на бюлетэнь могуць усе зацікаўленыя даслаўшы аплату гадавой падпіскі (**$30**) на адрас:*
VIESTKI
P. O. Box 3225
Farmingdale, NY 11735

*Чэкі з адзнакаю **“Весткі”** выпісвайце на імя скарбніка Згуртаваньня “Пагоня” **Viktar Yedzinovich**.*

*Падпіску таксама можна аформіць, наведаўшы ў інтэрнэце старонку **www.e-krama.com***